# ПАСЛАНЬНЕ ДА ЭФЭСЯНАЎ

1 Павал, воляю Божаю апостал Ісуса Хрыста, сьвятым,
што ў Эфэсе, і верным у Хрысьце Ісусе:
2 мілата вам і мір ад Бога, Айца нашага і Госпада Ісуса
Хрыста.
3 Дабраславёны Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса
Хрыста, што дабраславіў нас у Хрысьце ўсякім
духоўным дабраславеньнем у нябёсах,
4 бо Ён выбраў нас у Ім перад стварэньнем сьвету, каб
мы былі сьвятыя і беспахібныя перад Ім у любові,
5 наперад пастанавіўшы ўсынавіць Сабе нас празь
Ісуса Хрыста паводле ўпадабаньня волі Сваёй,
6 на хвалу славы мілаты Сваёй, якою Ён умілаваў нас
у Любасным,
7 у Якім мы маем адкупленьне Крывёю Ягонай,
дараваньне грахоў, паводле багацьця мілаты Ягонай,
8 якую Ён у вялікай шчодрасьці даў нам ва ўсякай
мудрасьці і разуменьні,
9 адкрыўшы нам таямніцу Сваёй волі паводле Свайго
ўпадабаньня, якое Ён загадзя паклаў у Ім,
10 на зьдзяйсьненьне паўнаты часу, каб усё нябеснае і
зямное паяднаць у Хрысьце;
11 у Ім мы і зрабіліся спадкаемцамі, і былі наперад
назначаны на тое згодна з воляй Таго, Хто ўсё чыніць
паводле хаценьня волі Сваёй,
12 каб заслужыцца на пахвалу славы Ягонай нам, якія
раней спадзяваліся на Хрыста;
13 у Ім і вы, пачуўшы слова праўды, абвяшчэньне
вашага выратаваньня, і ўвераваўшы ў Яго, пазначаны
пячаткаю абяцанага Духа Сьвятога,

14 Які ёсьць зарука спадчыны нашай, на адкупленьне
долі Ягонай, на хвалу славы Ягонай!
15 Таму і я, дачуўшыся пра вашую веру ў Хрыста Ісуса
і пра любоў да ўсіх сьвятых,
16 не перастаю дзякаваць за вас Богу, спамінаючы вас
у малітвах маіх,
17 каб Бог Госпада нашага Ісуса Хрыста, Айцец славы,
даў вам Духа мудрасьці і адкрыцьця на спазнаньне
Яго,
18 і прасьветліў вочы сэрца вашага, каб вы ўведалі,
у чым надзея заклікаеньня Ягонага, і якое багацьце
слаўнае спадчыны Ягонай для сьвятых,
19 і якая бязьмерная веліч магутнасьці Ягонае ў нас,
што паверылі празь дзеяньне ўладарнае сілы Ягонай,
20 якою Ён узьдзейнічаў у Хрысьце, уваскрэсіўшы Яго
зь мёртвых і пасадзіўшы праваруч Сябе на нябёсах,
21 найвышэй за любое начальства і ўладу, і сілу і
валадараньне, і ўсякае імя, называнае ня толькі ў
гэтым веку, але і ў будучым,
22 і ўсё ўпакорыў пад ногі Яму, і паставіў яго вышэй за
ўсё, галавою Царквы,
23 якая ёсьць Цела Ягонае, поўнасьць Таго, Хто
напаўняе ўсё ва ўсім.

# Эф 2

1 І вас, мёртвых за злачынствы і грахі вашыя,
2 у якіх вы калісьці жылі, згодна са звычаямі сьвету
гэтага, па волі князя, які ўладарыць у паветры, духа,
які дзее цяпер у сынах супраціву,
3 сярод якіх і мы калісьці жылі ў нашых плоцкіх
жадобах, выконваючы пахаценьне плоці і помыслаў,
і былі па прыродзе дзецьмі гневу, як і астатнія,
4 Бог, багаты міласэрнасьцю, зь вялікай сваёй любові,
якою палюбіў вас,

5 і нас, мёртвых за злачынствы, ажыватварыў з
Хрыстом, - мілатою вы ўратаваныя,
6 і ўваскрэсіў зь Ім і пасадзіў на нябёсах у Хрысьце
Ісусе,
7 каб зьявіць у наступных вяках найшчадрэйшае
багацьце мілаты Сваёй у даброці да нас у Хрысьце
Ісусе.
8 Бо мілатою вы ўратаваныя праз веру, і гэта не ад
вас, - Божы дар:
9 не ад дзеяў, каб ніхто не хваліўся.
10 Бо мы - Ягоныя стварэньні, створаныя ў Хрысьце
Ісусе на добрыя дзеі, якія Бог быў назначыў нам
выконваць.
11 Дык вось памятайце, што вы, колісь язычнікі па
плоці, якіх называлі «неабрэзанымі», так званыя
«рукатворна абрэзаныя на плоці»,
12 што вы былі ў той час бяз Хрыста, адсечаныя ад
грамадзтва Ізраільскага, чужыя запаветам абяцаньня,
ня мелі надзеі і былі бязбожнікі ў сьвеце;
13 а цяпер у Хрысьце Ісусе вы, што былі колісь далёка,
сталіся блізкімі Крывёю Хрыстоваю:
14 бо Ён ёсьць мір наш, Які зрабіў з двух адно і
зруйнаваў перашкоду пасярэдзіне -
15 скасаваўшы варожасьць Плоцьцю Сваёю, - а закон
запаведзяў - вучэньнем, каб з двух стварыць у Сабе
Самім аднаго новага чалавека, сталюючы мір,
16 і ў адным целе прымірыць абодвух з Богам крыжам,
забіўшы на гэтым варожасьць;
17 і, прыйшоўшы, «абвяшчаў мір вам, далёкім, і
блізкім»,
18 бо праз Яго і тыя і другія маем доступ да Айца, у
адным Духу.
19 Дык вось, вы ўжо ня чужынцы і ня прыхадні, а
суграмадзяне сьвятым і свае Богу,

20 уцьверджаныя на аснове апосталаў і пракакаў,
маючы Самога Ісуса Хрыста каменем вугла,
21 на якім увесь будынак, моцна складаны, вырастае
ў сьвяты храм у Госпадзе,
22 на якім і вы будуецеся ў селішча Божае Духам.

# Эф 3

1 Вось дзеля гэтага я, Павал, стаўся вязьнем Ісуса
Хрыста за вас, язычнікаў.
2 Бо вы, пэўна, чулі пра служэньне мілаты Божай,
дадзенай мне для вас,
3 таму што мне праз адкрыцьцё абвешчана таямніца,
- пра што я і вышэй коратка пісаў, -
4 дык вы, чытаючы, можаце ўведаць маё разуменьне
таямніцы Хрыстовай,
5 якая ня была абвешчана ранейшым пакаленьням
сыноў чалавечых, як сёньня адкрыта сьвятым
апосталам Ягоным і прарокам праз Духа (Сьвятога),
6 каб і язычнікі былі супольнымі спадчыньнікамі,
што складаюць адно цела, і саўдзельнікамі абяцаньня
Ягонага ў Хрысьце Ісусе праз зьвеставаньне,
7 слугою якога зрабіўся я пасьля дараваньня мілаты
Божай, дадзенай мне дзеяньнем сілы Ягонай.
8 Мне, самаму найменшаму з усіх сьвятых, дадзена
мілата гэтая - зьвеставаць язычнікам недасьледнае
багацьце Хрыстовае
9 і адкрыць усім, што ёсьць зьдзяйсьненьне таямніцы,
схаванай ад вечнасьці ў Богу, Які стварыў усё Ісусам
Хрыстом,
10 каб цяпер была вядомая праз Царкву начальству і
ўладам на нябёсах бясконцая мудрасьць Божая,
11 паводле спрадвечнага вызначэньня, якое Ён учыніў
у Ісусе Хрысьце, Госпадзе нашым,

12 у Якім мы маем адвагу і надзейны доступ праз
веру ў Яго.
13 А таму прашу (вас) не маркоціцца духам ад маіх
дзеля вас журботаў, бо яны - ваша слава.
14 Дзеля гэтага схіляю калені мае прад Айцом Госпада
нашага Ісуса Хрыста,
15 ад Якога мае найменьне ўсякая айчыннасьць на
нябёсах і на зямлі,
16 хай дасьць вам, па багацьці славы Сваёй, моцна
ўцьвердзіцца Духам Ягоным ва ўнутраным чалавеку,
17 каб Хрыстос вераю ўсяліўся ў сэрцы вашыя,
18 каб вы, укарэненыя і ўцьверджаныя ў любові, маглі
спасьцігнуць з усімі сьвятымі, што ёсьць шырыня і
даўжыня, і глыбіня і вышыня,
19 і ўразумець вышэйшую за ўразуменьне любоў
Хрыстовую, каб вам напоўніцца ўсёю поўніцаю
Божаю.
20 А Таму, Хто сілаю, якая дзее ў нас, можа зрабіць
непараўнена болей за ўсё, чаго мы просім, альбо пра
што думаем,
21 Таму слава ў Царкве ў Хрысьце ва ўсе роды, ад веку
да веку. Амін.

# Эф 4

1 Дык вось я, вязень у Госпадзе, малю вас хадзіць годна
званьня, у якое вы закліканы,
2 з усёй пакорлівай мудрасьцю і лагоднасьцю і доўгай
цярплівасьцю, у любові трываючы адзін аднаго,
3 імкнучыся захоўваць адзінства Духа ў саюзе міру.
4 Адно цела і адзін Дух, як вы і закліканы да адной
надзеі вашага пакліканьня;
5 адзін Гасподзь, адна вера, адно хрышчэньне,
6 адзін Бог і Айцец усіх, Які над усімі, і праз усіх, і ўва
ўсіх нас.

7 А кожнаму з нас дадзена мілата ў меру дару
Хрыстовага.
8 Таму і сказана: «падняўшыся на вышыню, запаланіў
паланёных і даў дары людзям».
9 А «падняўся» што азначае, як ня тое, што Ён і
сыходзіў раней у прадонныя мясьціны зямлі?
10 Хто сыходзіў, Ён жа ёсьць і Той, Хто ўзышоў над усе
нябёсы, каб напоўніць усё.
11 І Ён паставіў адных апосталамі, другіх прарокамі,
іншых дабравесьнікамі, іншых пастырамі і
настаўнікамі,
12 на дасканаленьне сьвятых, на дзею служэньня, на
збудаваньне Цела Хрыстовага,
13 пакуль усе прыйдзем у адзінства веры і спазнаньня
Сына Божага, у мужа дасканалага, у меру поўнага
росту Хрыстовае паўнаты;
14 каб мы ня былі больш недаросткамі, якіх хістаюць
і захапляюць усякія вятры навукі, каб падманам
людзкім, штукарскай хітрынай увесьці ў змусту.
15 А каб у шчырай любові ўсе ўзрасталі ў Таго, Які
ёсьць Галава, у Хрыста,
16 зь Якога ўсё цела, што складаецца і злучаецца
праз розныя ўзаемна жыўналучныя сувязі, у меру
дзеяньня кожнага асобнага чэлеса, атрымлівае
прырост цела на збудаваньне самога сябе ў любові.
17 Таму я кажу і заклінаю Госпадам, каб вы болей не
рабілі, як робяць астатнія народы ў марноце розуму
свайго,
18 бо яны запамрочаныя ў розуме, адчужаныя
ад жыцьця Божага з прычыны іхняга невуцтва і
зжарсьцьвеласьці сэрца іхняга;
19 яны, дарэшты зьнячуліўшыся, аддаліся распусьце
так, што робяць усякае паскудзтва ненасытна.
20 Але вы ня так навучыліся ад Хрыста,

21 бо вы чулі пра Яго і ў Ім навучыліся, - бо ісьціна ў
Ісусе, -
22 пазбыцца разам зь мінулым жыцьцём старога
чалавека, які парахнее ў панадных пахацінствах,
23 а абнавіцца духам розуму вашага
24 і апрануцца ў новага чалавека, створанага ў
падабенстве Божым, у праведнасьці і сьвятасьці
ісьціны.
25 Таму, адкінуўшы ману, гаварэце праўду кожны
блізкаму свайму, бо мы чэлесы адзін аднаму.
26 Гневаючыся, не грашэце: сонца хай ня зойдзе ў
гневе вашым;
27 і не давайце месца д'яблу.
28 Хто краў, больш ня крадзь, а лепей працуй, робячы
сваімі рукамі карыснае, каб было з чаго выдзяляць
таму, хто мае патрэбу.
29 Ніякае брыдкае слова хай ня выходзіць з вуснаў
вашых, а толькі добрае на будаўніцтва ў веры, каб яно
давала мілату слухачам.
30 І не зьневажайце Духа Божага, Якім мы запячатаны
ў дзень адкупленьня.
31 Усякае раздражненьне і лютасьць, і гнеў, і крык, і
ліхаслоўе з усякаю злосьцю хай будуць выдалены з
вас;
32 але будзьце адно да аднаго добрыя, спагадлівыя,
даруйце адно аднаму, як і Бог у Хрысьце дараваў вам.

# Эф 5

1 Дык вось, сьледуйце Богу, як дзеці любасныя,
2 і жывеце ў любові, як і Хрыстос палюбіў нас і аддаў
Сябе за нас у прынашэньне і ахвяру Богу, на пахошчы
прыемныя.

3 А распуста і ўсялякая нечысьць і любазьдзірства не
павінны нават упамінацца ў вас, як гэта прыстойна
сьвятым.
4 Таксама і брыдкаслоўе і пустаслоўе і пакепства не да
гонару вам; а наадварот, хай лепш будзе падзяка;
5 бо ведайце, што ніякі распусьнік, альбо нячысты,
альбо любазьдзірца, які ёсьць ідаласлужэнец, ня
мецьме спадчыны ў Царстве Хрыста і Бога.
6 Хай ніхто ня зводзіць вас пустымі словамі, бо за гэта
прыходзіць гнеў Божы на сыноў бунтоўных:
7 дык жа ня будзьце супольнікамі іхнімі.
8 Вы былі калісь цемра, а цяпер - сьвятло ў Госпадзе:
дык паводзьцеся, як дзеці сьвятла,
9 бо плод Духа - ва ўсякай даброці, праведнасьці і
ісьціне.
10 Шукайце таго, што да спадобы Богу,
11 і не бярэце ўдзелу ў бясплённых дзеях цемры, а
яшчэ і выкрывайце,
12 бо пра тое, што яны робяць таемна, сорамна і
казаць.
13 А ўсё, што выкрываецца, выяўляецца ў сьвятле, бо
ўсё, што робіцца яўным, ёсьць сьвятло.
14 Таму сказана: «устань, хто сьпіць, і ўваскрэсьні зь
мёртвых, і асьветліць цябе Хрыстос!».
15 Дык глядзеце, дзейце асьцярожна, не як
неразумныя, а як мудрыя,
16 цэнячы дорага час, бо дні - ліхія.
17 Дык ня будзьце ж неразважныя, а спазнавайце, што
ёсьць воля Божая.
18 І ня ўпівайцеся віном, ад якога бывае распуста; а
напаўняйцеся Духам,
19 настаўляючы саміх сябе псальмамі і славаслоўем і
духоўнымі сьпевамі, сьпяваючы і апяваючы ў сэрцах
вашых Госпада,

20 дзякуючы заўсёды за ўсё Богу і Айцу, у імя Госпада
нашага Ісуса Хрыста,
21 слухаючыся адно аднаго ў страху Божым.
22 Жонкі, упакорвайцеся сваім мужам, як Госпаду,
23 бо муж ёсьць галава жонкі, як і Хрыстос - галава
Царквы, і Ён жа Збаўца цела.
24 Але як Царква слухаецца Хрыста, так і жонкі сваіх
мужоў ва ўсім.
25 Мужы, любеце сваіх жонак, як і Хрыстос палюбіў
Царкву і аддаў Сябе за яе,
26 каб асьвяціць яе, ачысьціўшы мыцьцём водным,
праз слова;
27 каб прадставіць яе Сабе слаўнаю Царквою, бяз
плямы, без заганы, або чаго-небудзь падобнага, а каб
яна была сьвятая і беззаганная.
28 Так павінны мужы любіць сваіх жонак, як сваё цела:
хто любіць сваю жонку, любіць самога сябе.
29 Бо ніхто ніколі ня меў нянавісьці да сваёй плоці, а
корміць і грэе яе, як і Гасподзь Царкву;
30 бо мы часткі Цела Ягонага, ад плоці Ягонай і ад
касьцей Ягоных.
31 Таму «пакіне чалавек бацьку свайго і маці і
прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць двое адна плоць».
32 Тайна гэтая вялікая; я кажу пра Хрыста і пра
Царкву.
33 Так кожны з вас хай любіць сваю жонку, як самога
сябе; а жонка хай баіцца свайго мужа.

# Эф 6

1 Дзеці, слухайцеся сваіх бацькоў у Госпадзе, бо гэтага
патрабуе справядлівасьць.
2 Шануй бацьку твайго і маці - гэта першая запаведзь
з абяцаньнем:

3 «Хай будзе табе добра, і будзеш доўга жыць на
зямлі».
4 І вы, бацькі, не дакучайце дзецям вашым, а гадуйце
іх у навуцы і настаўленьні Гасподнім.
5 Рабы, слухайцеся гаспадароў сваіх цялесных са
страхам і трымценьнем, у прастаце сэрца вашага, як
Хрыста,
6 ня ў блізірнай толькі паслужлівасьці, як
чалавекадагоднікі, а як рабы Хрыстовыя,
выконваючы волю Божую ад душы,
7 служачы шчыра, як Госпаду, а ня як людзям,
8 ведаючы, што кожны атрымае ад Госпада ў меру
дабра, якое ён зрабіў, хай то раб, хай вольнік.
9 І вы, гаспадары, рабеце зь імі гэтак сама, лагодзьце
строгасьць, ведаючы, што і над вамі самімі і над імі
ёсьць на нябёсах Гасподзь, Які не зважае на асобы.
10 Нарэшце, браты мае, мацуйцеся Госпадам і
магутнасьцю сілы Ягонай;
11 апранецеся ў поўную зброю Божую, каб вам можна
было стаць супроць хітрыкаў д'ябальскіх;
12 бо нашае змаганьне ня супроць крыві і плоці,
а супроць начальстваў, супроць уладаў, супроць
сьветаўпраўцаў цемры сьвету гэтага, супроць духаў
злосьці паднябесных.
13 Дзеля гэтага прымеце поўную зброю Божую, каб вы
маглі супрацьстаць у часіну ліхую і, усё адолеўшы,
выстаяць.
14 Так што станьце, апаясаўшы сьцёгны вашыя
праўдаю, і апрануўшыся ў браню праведнасьці,
15 і абуўшы ногі ў гатовасьць абвяшчаць мір;
16 а найперш за ўсё вазьмеце шчыт веры, якім
зможаце пагасіць усе распаленыя стрэлы ліхадзея;
17 і шалом ратунку вазьмеце, і меч духоўны, які ёсьць
Слова Божае;

18 усякаю малітваю і просьбаю малецеся ў любы час
духам, і дбайце пра гэта самае з усёй сталасьцю і
благаньнем за ўсіх сьвятых
19 і за мяне, каб мне дадзена было слова - вуснамі
маімі адкрыта і адважна абвяшчаць таямніцу
зьвеставаньня,
20 дзеля якога я пасольствую ў кайданах, каб я сьмела
прапаведаваў, як я і павінен.
21 А каб і вы ведалі пра мае акалічнасьці і дзеі, пра ўсё
раскажа вам Тыхік, любасны брат і верны ў Госпадзе
службіт,
22 якога я і паслаў да вас на тое самае, каб вы
даведаліся пра нас і каб ён суцешыў сэрцы вашыя.
23 Мір братам і любоў зь вераю ад Бога Айца і Госпада
Ісуса Хрыста.
24 Мілата з усімі, што нязьменна любяць Госпада
нашага Ісуса Хрыста. Амін.

# Біблія (пераклад В.Сёмухі)
# The Holy Bible in Belarusan
## Белорусское Новый Завет и Притчи

copyright © 2016 John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

Language: Belarusian

Translation by: Antoni Bokun

Contributor: John the Forerunner Church of Christians of Evangelical Faith of Minsk City

This translation is made available to you under the terms of the Creative Commons Attribution-No Derivatives license 4.0.
You may share, redistribute, or adapt this Bible translation or extracts from it in any format, provided that:

You include the above copyright and source information.

You do not use this work for commercial purposes.

Pictures included with Scriptures and other documents on this site are licensed just for use with those Scriptures and documents. For other uses, please contact the respective copyright owners.

2019-12-29

---

PDF generated using Haiola and XeLaTeX on 11 Nov 2022 from source files dated 29 Jan 2022
5bafea06-5eb3-574c-9054-5e4b38c21bbc